Веслаў ПАКЛАДЭК:

# «МЫ СУСЕДЗІ І ПАВІННЫ ЗАЎСЁДЫ ІМКНУЦЦА ДА ЛЕПШАГА!»



**ДРУГОЕ пасяджэнне Сумеснай польска-беларускай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве, якое прайшло ў студзені ў Мінску, адбылося ва ўмовах значнага паніжэння таваразвароту паміж нашымі краінамі. Якія меры для пераадолення негатыўных тэндэнцый і наступнага паспяховага партнёрства былі прапанаваны падчас названага мерапрыемства? На гэтае і іншыя пытанні «Звязды» адказвае кіраўнік аддзела садзейнічання гандлю і інвестыцыям, першы дарадца Пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь Веслаў ПАКЛАДЭК.**

— Крызіс сапраўды адбіўся на нашым таваразвароце, — адзначыў спадар Пакладэк. — На пасяджэнні Сумеснай камісіі было прапанавана некалькі мерапрыемстваў, якія змогуць у пэўнай ступені інтэнсіфікаваць наша супрацоўніцтва і ўзаемны тавараабмен. Вядома, вынікі не з'явяцца імгненна, для гэтага патрэбен час. Кажучы аб прапановах, мы маем на ўвазе, у першую чаргу, праекты ў беларускай энергетыцы. У найбліжэйшай будучыні яны павінны ўзмацніць наша ўзаемадзеянне ў эканамічнай галіне, а канкрэтна — стымуляваць рост гандлю паміж нашымі краінамі. Таксама з гэтай мэтай ёсць намер пабудаваць паміж Беларуссю і Польшчай прадуктаправад, па якім будзе пастаўляцца звадкаваны газ на польскі бок. Каб зэканоміць на транспарце, прапаноўваецца будаўніцтва паміж населенымі пунктамі Свіслач—Вавілы працягласцю ў 30—40 кіламетраў. Да іншых дзеянняў, якія ў будучыні могуць станоўча адбіцца на тавараабмене, адносіцца дэклараваная дапамога польскіх устаноў у прасоўванні беларускіх тавараў на рынак Польшчы, а тым самым і Еўрасаюза.

Беларускі бок падчас пасяджэння камісіі прадэманстраваў свае дадатковыя экспартныя магчымасці, у тым ліку ў металургічнай, электратэхнічнай і сельскагаспадарчай галінах, што было перададзена на разгляд прадстаўнікам польскага бізнэсу.

Заўважу, што ў польскага боку ёсць таксама іншыя канструктыўныя прапановы. У прыватнасці, наша кампанія «Фамур» актыўна працуе ў Беларусі і прапануе пачаць сумесную вытворчасць надзейнай і недарагой тэхнікі для шахтаў аб'яднання «Беларуськалій». Польскія прадпрымальнікі бачаць магчымасць укаранення вынікаў іх добрых распрацовак. Калі працэс пойдзе, гэта паўплывае на павелічэнне ўзаемнага таваразвароту, а ў перспектыве гэта тэхніка можа быць і прадметам паставак у іншыя краіны, напрыклад, у Расію і ва Украіну.

Наступны момант — гэтае прызнанне Еўрасаюзам для Беларусі прэферэнцый (GSP), якія яна мела раней. Мы за тое, каб сёлета тут таксама з'явіўся істотны прагрэс, але для гэтага патрэбныя пэўныя дзеянні з беларускага боку. Мы садзейнічаем усяму, што спрыяе развіццю эканамічных кантактаў Беларусі з Польшчай — членам Еўрасаюза. Бо мы суседзі і ў адносінах паміж нашымі краінамі заўсёды павінны імкнуцца да лепшага.

***— Мытны саюз Беларусі, Расіі і Казахстана, безумоўна, стварае новыя ўмовы для развіцця і польска-беларускага супрацоўніцтва, выводзячы яго на якасна новы ўзровень. Гэта пытанне актыўна абмяркоўвалася і на пасяджэнні камісіі. Якія перспектывы бачацца вам у гэтай сувязі?***

— Сёння наконт Мытнага саюза пакуль яшчэ складана сказаць нешта канкрэтнае. На жаль, такія арганізацыі нараджаюцца, пераадольваючы шматлікія праблемы. Мы верым, што будуць вынікі, але не варта чакаць іх імгненнага з'яўлення. Для Польшчы, нашага бізнэсу і Еўрасаюза ў цэлым гэта, верагодна ў будучыні, будзе плюсам. Мяркуем, што некаторыя пытанні змогуць хутчэй разглядацца ў плоскасцях глабальных: Еўрасаюз — Мытны саюз. Для нашых прадпрыемстваў станоўчым гэты саюз стане ў тым выпадку, калі будзе працаваць так, як працуе Еўрапейскі саюз. Але на сёння ёсць і адмоўныя праявы пачатку дзейнасці Мытнага саюза. Польскія прадпрымальнікі, якія прыйшлі ў Беларусь як інвестары і атабарыліся ў свабодных эканамічных зонах, цяпер адчуваюць некаторы дыскамфорт. У іх з'явіліся шматлікія невядомыя: як іх надалей будуць трактаваць, у якой ступені захаваецца іх статус і г.д. Адсутнасць канкрэтных рашэнняў для захавання стабільнасці працы ў СЭЗ з'яўляецца свайго роду тормазам для прыходу туды новых прадпрыемстваў. Давядзецца трохі пачакаць, каб польскія прадпрымальнікі сталі з аптымізмам глядзець на Мытны саюз.

На пасяджэнні двухбаковай камісіі бакі дамовіліся аб правядзенні ў першым квартале гэтага года ў Варшаве форуму-семінара, у якім возьмуць удзел беларускія прадстаўнікі Міністэрства замежных спраў, Дзяржаўнага мытнага камітэта, Міністэрства эканомікі. Беларускі бок паспрабуе паказаць прынцыпы працы Мытнага саюза і падзяліцца вопытам першых месяцаў яго існавання, а таксама прадэманстраваць яго пазітыўныя бакі ў будучыні. Гэта — правільнае рашэнне: чым раней польскія прадпрымальнікі будуць валодаць такой інфармацыяй, тым хутчэй будзе развівацца наша далейшае супрацоўніцтва.

***— Па выніках сустрэчы, якая адбылася ў Мінску, была падпісана дамова паміж Дзяржаўным камітэтам па маёмасці Рэспублікі Беларусь і польскім акцыянерным таварыствам «AKJ Capital» аб прадстаўленні інтарэсаў Беларусі па пытаннях прыцягнення ў яе інвестыцый. Што стаіць за гэтай дамовай?***

— Наша кампанія выкарыстала беларускі закон аб інвестыцыйных агентах. «AKJ Capital» прыйшла да высновы, што ў яе ёсць добрыя кантакты не толькі ў Польшчы, але і ў Еўропе, і яна можа быць тым звяном, якое пастараецца прыцягнуць у Беларусь інвестараў. З беларускага боку дамовай вызначаны арганізацыі і ўстановы для падтрымкі і ўзаемадзеяння, такія, як «Белхарчпрам», «Белнафтахім», Мінскі аблвыканкам. Што датычыцца метадаў, то адзін з іх — гэта перакананне патэнцыйных інвестараў. У нашай кампаніі ёсць вопыт у іх пошуку, і яе дзейнасць будзе накіравана на тое, каб садзейнічаць іх прыходу ў Беларусь. Знакавым з'яўляецца тое, што гэта — дамова нумар адзін, якую падпісаў Урад Беларусі з польскай арганізацыяй у якасці інвестыцыйнага агента.

Калі казаць аб польскіх інвестыцыях у Беларусі, то наша Пасольства пастаянна вядзе працу ў гэтым напрамку. Мы кансультуем як нашых, так і вашых прадпрымальнікаў. Магу сказаць, што ў пачатку мінулага года польскія партнёры праяўлялі большую цікавасць да інвеставання ў беларускую эканоміку. У другой жа палове гэта цікавасць пайшла на спад. Магчыма, гэта звязана з крызісам або з прыпыненнем лібералізацыі беларускай эканомікі. Але сам факт, што польскія інвестары пастаянна цікавяцца і пастаянна з'яўляюцца на беларускім рынку ўжо ў канкрэтнай справе, азначае, што працэс, хоць і павольна, але працягваецца.

***— Сёння Польшча і Беларусь працягваюць працу па праекце электрастанцыі ў Зэльве. Якія новыя перспектыўныя прапановы ў энергетычнай сферы абмяркоўваліся ў Мінску?***

— Зэльва — гэта, вядома, найважнейшы праект на сёння. Праца пастаянна ідзе, і аб яе выніках нас будуць апавяшчаць. Падчас студзеньскай сустрэчы ў Мінску таксама абмяркоўваўся новы праект, у якім Польшча можа адыграць кансультацыйную ролю, асабліва ў пачатку яго развіцця. Беларускі бок папрасіў дапамагчы ў справе здабычы і эксплуатацыі бурага вугалю, залежы якога ёсць у беларускай зямлі і якія дагэтуль не выкарыстаны. У Польшчы ёсць вялікі вопыт у гэтай галіне. У нас ёсць тры вялікія басейны бурага вугалю каля гарадоў Туруў, Белхатув і Конін. Натуральна, ёсць практыка распрацоўкі кар'ераў і злучэння здабычы вугалю з вытворчасцю электраэнергіі. Мы гатовыя дапамагчы. Для Беларусі, як я разумею, праект мае вялікае значэнне. Бо калі можна выкарыстаць альтэрнатыўную крыніцу энергіі, то варта гэта зрабіць.

***— Сёння вывучаецца магчымасць сумеснай працы ў нафтагазавай сферы, хімічнай прамысловасці, чыгуначных перавозках, сельскай гаспадарцы. Якія праекты па гэтых напрамках распрацоўваюцца цяпер?***

— У любой з гэтых сфераў мы можам узаемадзейнічаць. Але пакуль яны ў стадыі распрацоўкі. У хімічнай прамысловасці, як было сказана вышэй, будаўніцтва прадуктовага трубаправода. Калі казаць аб чыгуначных перавозках, ёсць ідэя сумеснага выкарыстання кантэйнернага тэрмінала, які нядаўна быў уведзены ў эксплуатацыю ў порце горада Гданьска. Напрыклад, ажыццяўленне перавозак кантэйнераў з Гданьска ў Кітай праз Польшчу і Беларусь. Гэты праект мае шанцы на рэалізацыю. У Гданьскага порта наладжаны дзелавыя адносіны з рознымі партамі ў свеце. Наша ідэя можа быць цікавай многім, у тым ліку і Беларусі. Ёсць таксама рашэнні па стварэнні лагістычных цэнтраў з польскім капіталам. Побач з беларускім горадам Жабінка адзін з такіх праектаў пачынае рэалізоўвацца.

Што датычыцца харчовай галіны, то тут пакуль няма новых канкрэтных інвестараў. Але мы рады, што некаторыя беларускія заводы мадэрнізуюцца з дапамогай польскага абсталявання, якое адпавядае сучасным патрабаванням і адрозніваецца прымальнымі цэнамі, а таксама пастаўляецца ў крэдыт на нармальных агульнаеўрапейскіх умовах.

***— Падчас пасяджэння камісіі немалаважнае значэнне надавалася маламу і сярэдняму бізнэсу. Якія рашэнні па развіцці ўзаемадзеяння малых і сярэдніх прадпрыемстваў Польшчы і Беларусі будуць увасабляцца ў жыццё ў найбліжэйшай будучыні?***

— У гэтай справе канкрэтыкі не вельмі шмат. У асноўным уся праца накіравана на кантакты, перадачу вопыту польскіх прадпрыемстваў. Ад беларускіх бізнэсменаў мы таксама чакаем абмену вопытам для таго, каб польскія партнёры маглі атрымліваць больш ведаў аб вашай эканоміцы. Але пакуль усё зводзіцца да таго, каб навучаць малы і сярэдні бізнес, даць яму тыя веды, якія з'яўляюцца эфектыўнымі пры вядзенні бізнэсу. Тут маюцца на ўвазе розныя семінары, якія праводзяцца і ў Польшчы, і ў Беларусі. Наша Агенцтва па развіцці малога і сярэдняга бізнэсу збіраецца праводзіць семінары для беларускіх прадпрымальнікаў. Гэтым пытаннем хочуць заняцца і Польская гаспадарчая палата, і Польскае агенцтва інфармацыі і замежных інвестыцый. Гэта накіравана на так званую інтэрнацыяналізацыю малога і сярэдняга бізнэсу. Вядома, трэба ўлічваць, што не ўсе нашы прынцыпы можна ўвесці ў дзейнасць беларускіх бізнэсменаў, бо эканамічныя сістэмы Польшчы і Беларусі шмат у чым адрозніваюцца. Але спадзяёмся, што з цягам часу беларуская эканоміка будзе бліжэй да эканомікі Еўрасаюза.

Тут варта ўзгадаць і семінары для дзяржаўных службоўцаў. Бо патрэбны новыя веды і новыя спосабы працы з бізнэсам і наведвальнікамі, і гэта абгрунтавана. Асаблівая ўвага будзе надавацца працэсу складання праектаў у рамках фондаў ЕС або Усходняга партнёрства, што вельмі актуальна сёння. Кіраўніцтва Любускага ваяводства, напрыклад, прапанавала Гомельскаму аблвыканкаму, з якім у іх існуюць партнёрскія сувязі, навучанне дзяржаўных службоўцаў падрабязнасцям падрыхтоўкі праектаў, што з'яўляецца асаблівай каштоўнасцю.

***— У першай палове лютага міністры замежных спраў дзвюх краін падпісалі Дамову аб правілах прымежнага руху. Якія ўмовы, па вашым меркаванні, гэта створыць для развіцця турыстычнай сферы?***

— Думаю, гэта будзе вельмі добры крок для кантактаў асабліва ў памежнай зоне. Ёсць верагоднасць, што гэта дамова станоўча паўплывае і на турыстычную сферу, і дасць новы імпульс для ўсталявання новых сувязяў. Што датычыцца турызму, то я лічу, што разглядаць прымежны рух як значную крыніцу яго развіцця не варта. Хоць Аўгустоўскі канал можа даць пэўныя вынікі, таму што як польскі, так і беларускі бок зацікаўлены ў сумеснай справе. Дамова паўплывае не толькі на турыстычную сферу, але і на іншыя. Гэта можа быць добрым імпульсам і для трансгранічнага супрацоўніцтва.

**Размову вялі Кацярына ДАРАФЕЙЧЫК і Барыс ЗАЛЕСКІ.**

Мода. Стыль. Шарм.




Прамысловасць. Энергетыка. Рэсурсы.

ЯВЛЯЕМСЯ ОФИЦИАЛЬНЫМ ПОСТАВЩИКОМ НА ВОСТОЧНЫЙ РЫНОК ТАКИХ ПРОДУКТОВ, КАК:

- инжекторные питатели;
- скребки нефтяные;
- рукавные фильтры для жидкостей;
- рефрактомеры;
- pH-метры;
- промышленные системы фильтров;
- контейнеры;
- резервуары;
- датчики уровня;
- грузовики для транспортировки теплоносителя.

**Контакт:** «Cieplownia Siemianowice» Sp. z o.o.
ul. Olimpijska 14, 41-100 Siemianowice Slaskie, Polska/Польша.
**Тел./факс: + 48 32 228 07 69.**
**E-mail:** marketing@cieplowniasiemianowice.pl
**Http:**//www.cieplowniasiemianowice.pl/offer.pdf

Архітэктура. Будаўніцтва. Рамонт.

BARIL Fortis First In Polyurethane



Компания Baril Coatings (Барил Коутингс) — производитель антикоррозионных покрытий для стальных и бетонных конструкций. Предлагаем широчайший спектр продуктов для оптимального выбора систем окраски соответственно требованиям объекта стандарту ISO 12944. Имеем сертификат качества ISO 9001:2000, ISO 14001, а также NORSOK, COT.

Предлагаем также полную гамму декоративных красок.

Наша современная система позволяет воспроизвести любое повторение цвета палитры RAL, NCS и т.д.

Ищем эксклюзивного дистрибьютора для продажи наших красок. Обеспечим техническую поддержку и рекламные материалы.




Для получения более подробной информации просим обращаться: +48 32 279 32 15; www.baril.pl